23. Сорокин, В. Г. День опричника / В. Г. Сорокин. – М.: Захаров, 2006. – 224 с.
24. Сорокин, В. Г. Сахарный Кремль / В. Г. Сорокин. – М.: АСТ, 2008. – 352 с.
25. Шлыков, В. Как Владимир Сорокин разочаровался в постмодернизме и полюбил волшебную сказку / В. Шлыков [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://clck.ru/32iCCR. – Дата доступа: 18.11.2022.
26. Сорокин, В. Г. Доктор Гарин / В. Г. Сорокин. – М.: CORPUS, АСТ, 2021. – 544 с.

**А. І.Матачкіна-Радковіч,**
*аспірант (ГрДУ імя Янкі Купалы, Гродна, Беларусь)*

## ВОБРАЗНЫЯ (ЛІТАРАТУРНЫЯ І ФАЛЬКЛОРНЫЯ) І МАТЫЎНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ІНТЫМНАЙ ЛІРЫКІ Г. БУРАЎКІНА І Д. БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВАЙ У КАНТЭКСЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ЛІРЫЧНАЙ ТРАДЫЦЫІ

***Анатацыя.*** *У дадзеным артыкуле разглядаюцца вобразныя і матыўныя асаблівасці інтымнай лірыкі беларускіх пісьменнікаў Г.Бураўкіна і Д.Бічэль-Загнетавай. Пры аналізе іх інтымнай лірыкі можна сцвярджаць, што яна ўяўляе сабой заканамерны працяг у развіцці інтымнай паэзіі класічнай беларускай літаратуры. Прасочваецца цесная сувязь і пераймание нацыянальнай лірычнай традыцыі сучаснікаў, ад знакавых прадстаўнікоў беларускай класікі, такіх як Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, К. Буйло.*

***Ключавыя словы:*** *лірычная традыцыя; інтымная лірыка; матыў; паэзія; фальклор; вобраз-сімвал; класічная літаратура; сучасная літаратура.*

**A. I. Matachkina-Radkovich,**
*postrgraduate student (Yanka Kupala State University of Grodna, Grodna, Belarus)*

## FIGURATIVE (LITERARY AND FOLKLORE) AND MOTIVATIONAL FEATURES OF THE POETRY OF G. BURAVKIN AND D. BICHEL-ZAGNETOVA IN A LYRICAL CONTEXT

***Abstract.*** *This article examines the figurative and motivational features of the intimate lyrics of the Belarusian writers G. Buravkin and D. Bichel-Zagnetova. When analyzing their intimate lyrics, it can be argued that it represents a natural continuation in the development of the intimate poetry of classical Russian literature. There is a close connection and imitation of the national lyrical tradition of contemporaries, from iconic representatives of the Belarusian classics, such as Y. Kupala, Y. Kolas, M. Bogdanovich, K.Builo.*

***Key words:*** *lyrical tradition; intimate lyrics; motif; poetry; folklore; image-symbol; classical literature; modern literature.*

Інтымная лірыка багатая на пачуцці і эмоцыі, яна ўключае ў сябе ўсе грані чалавечай душы. Пачуцці ўзнікаюць у падсвядомасці асобы, з’яўляюцца рэакцыяй на падзеі паўсядзённага жыцця. Усеабдымным пачуццём, якое не страчвае сваёй актуальнасці і запатрабаванасці ні ў літаратуры, ні ў філасофіі, ні ў іншых навуках па сёняшні дзень з’яўляецца каханне. Безумоўна, інтымная паэзія не засяроджваецца толькі на лірыцы кахання: яна распавядае аб інтымных пачуццях і перажываннях, з якімі сутыкаецца лірычны герой.

Тэма кахання бярэ свае вытокі яшчэ з Антычных часоў. Аднак, прадстаўнікі старажытнагрэчаскай літаратуры, паэты Архілох і Мімнерм, праявілі сябе як прыхільнікі розных накірункаў у адносінах да паняцця кахання, што з’яўляецца пацвярджэннем індывідуальнай своеасаблівасці гэтага інтымнага пачуцця.

У эпоху Сярэднявечча паэты ў сваіх творах аддавалі перавагу паказу любові да Бога, звярнуўшы сваё разуменне на тэалагічную канцэпцыю, але пры гэтым не гублялі цікавасці да ўзвышанага і вытанчанага кахання.

Адданасць у апяванні шчырага пачуцця не страціла сваёй актуальнасці і ў старажытнай беларускайлітаратуры, калі Мікола Гусоўскі, Ян Вісліцкі, Сімяон Полацкі дакрануліся да ўслаўлення важнасці інтымных пачуццяў да жанчыны.

Не выключэннем у працягу інтымнай лірычнай традыцыі сталі і знакавыя прадстаўнікі беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя. Максім Багдановіч, Якуб Колас, Янка Купала, Канстанцыя Буйло, Цётка – творцы, якіх, найперш яднае нацыянальная ідэя і паэтызацыя любові да Бацькаўшчыны, адданае служэнне народу, агульначалавечая праблематыка. Паэтаў хвалююць адвечныя пытанні жыцця і смерці, вечнага і часовага, духоўнасці асобы і высокага прызначэння чалавека. Не ў такой ступені акрэсліваецца інтымны аспект лірычнай паэзіі згаданых творцаў і асабліва тэма кахання, яе матывы  і вобразы, фальклорная аснова і архетыпічныя канстанты, а таксама жанравае ўвасабленне мастацкага свету кахання.

Разглядаючы сучасную беларускую інтымную лірыку, можна з упэўненасцю сказаць аб адкрытасці ў праяве сваіх пачуццяў, але ў той жа час сціпласці і таямнічасці аўтараў, такіх як Р.Барадулін, А.Вярцінскі, В.Зуёнак, Я.Сіпакоў, Н.Гілевіч, У.Караткевіч, М.Стральцоў, Г.Бураўкін, Д.Бічэль-Загнетава і іншых мастакоў слова.

У творчай шматаблічнасці “сучаснікаў” не згубіліся постаці  Генадзя Бураўкіна і Дануты Бічэль-Загнетавай, паэзія якіх па праву прызнана з'явай надзвычай непаўторнай, унікальнай. Яна шматколерна, пластычна і эмацыянальна ўзнаўляе навакольны свет, адлюстроўвае прыгажосць роднай зямлі, пафас стваральнай працы. Іх вершы  пазнаюцца па глыбокай эмацыянальнасці, яркай вобразнасці, яскравых эпітатах, метафарах і параўнаннях, рытміцы, унутранай рыфме. На жаль, іх інтымная лірыка не была аб’ектам спецыяльнага даследавання, аналіз і мастацкая спецыфіка вершаў пра каханне не праводзілася. Акрамя таго, раней не было вызначана месца інтымнай лірыкі Г.Бураўкіна і Д.Бічэль-Загнетавай у кантэксце нацыянальнай лірычнай традыцыі

Узоры сучасных вершаў пра каханне даюць падствы меркаваць аб непарыўнай сувязі з класічнай інтымнай лірыкай. Мяркуем, што менавіта творы класікаў-творцаў, узнікнуўшы ў перыяд зараджэння новай беларускай літаратуры, валодаюць дастатковай мастацкай сілай, якая паўплывала на далейшае агульнакультурнае, у тым ліку і літаратурнае, жыццё. Творы класікаў сталіся пэўным арыенцірам, які дазваляе ўбачыць, што замацавалася ў інтымнай паэзіі абраных паэтаў, а што знаходзіцца ў пастаянным руху, абнаўленні, з’яўляецца прыналежнасцю аўтарскага стылю.

Для таго, каб прасачыць, ці выяўляюць інтымныя вершы класікаў Купалы, Коласа, Багдановіча, Буйло і вершы Дануты Бічэль-Загнетавай і Генадзя Бураўкіна, як блізкароднасныя рысы, сфарміраваныя адной літаратурнай традыцыяй, так і яркую індывідуальнасць кожнага творцы, абумоўленую ўласным мастацкім стылем і характэрным успрыманнем свету, неабходна звярнуць увагу на матыўна-вобразную асаблівасць і фальклорныя набыткі.

Паэтычны свет пісьменнікаў раскрываецца праз шматгранныя матывы, са сваімі тайнымі псіхалагічнымі адценнямі, што хвалююць чалавека ва ўсе часы. Вобраз кахання ў лірыцы паэтаў паўстае як удалы паказчык светаўспрымання і падсвядомага.

У інтымнай лірыцы Янкі Купалы надзвычай актуальны з’яўляецца матыў абароны кахання і каханай. Лірычны герой робіць усё магчымае дзеля таго, каб яго дзяўчына была супакоенай, шчаслівай. Паэт хоча, каб яна пакахала «ўсёй душой» не патрабуючы нічога ўзамен.

*Пакахай жа мяне толькі*
*Усяей душой,*
*Не дай з жалю марнавацца,*
*Сэрца супакой!* [1, с. 106]

У лірыцы Генадзя Бураўкіна таксама можна сустрэць матыў абароны кахання і каханай, так у вершы «Я ўсіх вас» лёгка заўважыць сур’ёзнасць намераў закаханага, яго самыя запаветныя мары і жаданні:

*Я самую прыгожую з дзяўчат*

*Схаваў ад вас, забраў ад вас навекі.*
*Яе радзімкі, локаны і вейкі*
*Пяшчотна лашчыць толькі мой пагляд.* [2, с. 19]

Разнастайнасць матываў – адна з галоўных паказальнікаў багатай творчасці паэта. Абарона закаханай, успаміны шчаслівага кахання, горыч ад разлукі, надзея на добрую будучыню – многае можна сустрэць у творчасці Г. Бураўкіна, акрамя гэтага, творца звяртаецца да вельмі патаемнага і глыбокага матыву ненароджанага дзіцяці. Аўтар у сваіх вершах-споведзях шкадуе жанчын, якія не зведалі шчасця: быць маці.

*Шкадую жанчын,*
*Што пасля пацалунка мужчыны*
*Не зведалі асалоду пацалунка дзіця…*
*……………………………………*
*Шкадую жанчын,*
*Што пасля мужчынскіх абдымкаў*
*Не зведалі пяшчоты абдымкаў дзіця…* [2, с. 51]

Якуб Колас надаваў значную ўвагу не толькі хвілінам шчасця і радасці, але вытанчана перадаваў стан адзіноты і яго пераадольвання. У вершы «М.Д.М.» Якуб Колас не ўпершыню звяртаецца да жонкі, яго каханне раскрывае душэўны стан героя, багацце яго духоўнага свету, яго хваляванні і перажыванні. Адзінота становіцца настолькі балючай для паэта, што ён адчайна пытаецца вымаліць прабачэнне за ўсю тугу і роспач, нанесеную ім самым. Класік пранёс сваё каханне праз усё жыццё, і нараджаецца думка, што ён будзе несці яго бясконца.

*Ты без мяне, а я далёка.*
*Над стэпам звіс нябёсаў тын,*
*А снег стэповы слепіць вока,*
*І сумна мне, бо я адзін.* [3, с. 365]

У Максіма Багдановіча каханне ўяўляецца прыгожым, светлым пачуццём, менавіта яно ўзвышае чалавека, робіць яго высакароднейшым і лепшым.  Каханне прыносіць Багдановічу і радасць і сум. Матыў ростані з абранніцай свайго сэрца сустракаецца ў шматлікіх вершах паэта. Пакуты закаханага вельмі моцныя і важкія.

*Мне доўгае расстанне з Вамі*
*Чарней ад Вашых чорных кос.* [4, с. 362]

Генадзь Бураўкін неаднаразова ўказвае на сваю адзіноту, звяртаючы ўвагу на незразумеласць прычын ростані з каханай. Думкі паэта насычаны роздумамі і намаганнямі адшукаць адказы на свае хвалюючыя пытанні.

*А сягонняблукаю*
*Я адзін да святла*
*І прычыны не знаю,*
*Што з табой развяла.* [2, с. 11]

Часта ў сваіх інтымных вершах Максім Багдановіч пачынае сваю любоўную біяграфічную гісторыю з успамінаў, менавіта ў іх закладзена ўсё патаемнае, тое, што засталося ў душы і сэрцы паэта. Матыў успамінаў характарызуе М.Багдановіча, як патаемную вытанчаную асобу.

*«Дзень гэты, – так пісаў Катул, –*
*Я белым каменем адзначу».*
*Дасюль я рад, калі пабачу*
*Алею, дзе пад ліпаў гул*
*Мне парасонкам на пяску*
*Штось ручкі мілыя пісалі,*
*Што – не скажу. Вы адгадалі,*
*І словы ўжо на языку.* [4, с. 69]

Генадзь Бураўкін для перадачы сваіх пачуццяў таксама неаднаразова звяртаецца да дадзенага матыву. Успаміны ў паэта могуць выклікаць розны спектар эмоцый, яны могуць трывожыць, супакойваць, грэць душу, турбаваць сэрца. Важна тое, што яны ёсць, і яны займаюць важнае месца ў яго лірычнай сістэме.

*Клёны росамі зззяюць,*

*Птушкі сонца гукаюць,*

*Росам зоры варожаць,*

*Успамінам трывожаць*

*Маё сэрца.* [2, с. 14]

Канстанцыя Буйло адкрыта дзеліцца сваёй закаханасцю з навакольнай рэчаіснасцю, не прыхоўваючы сваіх пачуццяў. Матыў шчаслівага кахання адлюстроўваецца ў многіх вершах паэткі. Усё тое, што адбываецца ў каханні адлюстроўваецца на душэўным стане лірычнай гераіні.

*Як я цябе люблю - хай скажа гэта мора,*

*Што у грудзях маіх бушуе, хай гавора*

*Аб тым сэрца, што пагляд тваіх вачэй*

*Сон прабудзіў яго, аж дрогнула сільней.* [5, с. 112].

Данута Бічэль-Загнетава, у сваю чаргу, таксама праяўляе свае пачуцці як сапраўдная жанчына: яна з узрушанасцю і захапленнем адносіцца да свайго кахання.

*Звініць у сэрцы радасць, як жаўрук,*

*Якога нельга прывучыць да рук.* [6, с. 43]

Раненая адзінотай і тугой лірычная гераіня Канстанцыі Буйло адчувае сябе стомленай і забытай, аддаленай ад такога пачуцця, як каханне. Але, ў той жа час, гэтая адзінота стварае ўмовы у якіх жанчына становіцца стойкай і мужнай сваім характарам, духам.

*Без цябе мне і сонца не свеціць ў акно,*

*І абяснайвясне не шапочуцьлісты...*

*Цяжкажыцьаднаму - жыць не лёгка адной,*

*Гэта ведаеш, пэўна, і ты.* [7, с. 134].

У пачуцці лірычнай гераіні Дануты Бічэль-Загнетавай выразна пранікае *роспач і туга*, выкліканыя стратаю блізкага чалавека. Увесь навакольны свет змяняе сваё аблічча: у ім блякнуць яркія фарбы, згадваюцца прыродныя дэталі, што асацыіруюцца са станам адзіноты і холаду:

*Ужо мы не наловімзораў*

*У студні досвіткаў на дне…*[8, с. 223]

Другім вектарам даследавання з’яўляецца фальклор. Фальклорныя традыцыі закладзены ў творчасць спакон вякоў, нездарма яны перадаюцца з пакалення ў пакаленне, адлюстроўваючы пэўныя культурныя старонкі чалавечага жыцця.

Даследчыца А.Э.Сабуць у сваім артыкуле «Традыцыі фальклорнай паэтыкі ў лірыцы Янкі Купалы і Рыгора Барадуліна» значна заўважыла: «Адпаведнасць паміж двума тыпамі мастацкага мыслення – фальклорам і літаратурай – не толькі ў засваенні стылявых і вобразна-структурных элементаў вусна-паэтычнай творчасці, але і ў выяве самога падыходу, ацэнкі адлюстравання з’яў рэчаіснасці. Пафас народнасціў творчасці таго ціінщага шсьменніка грунтуецца на плённай сувязі з народнай свядомасцю, з жывым народным словам.» [9, с. 170]

Паэты ў сваёй інтымнай лірыцы актыўна выкарыстоўваюць фальклорныя элементы, напрыклад вобразы-сімвалы. З іх дапамогай аўтар стварае маляўнічаю карціну-асацыяцыю, перадае адносіны да аб’екта свойго закахання, праяўляе свае пачуцці, адлюстроўвае душэўны стан лірычнага героя.

Яскравым узорам паэта, які актыўна і ўмела выкарыстоўваў фальклорныя вобразы-сімвалы, з’яўляецца Янка Купала. Важнае месца ў яго сістэме вобразаў прысвечана дрэвам: явару і каліне. Шырокавядома, што вобраз

явара тлумачыцца яго паходжаннем (хлопец, якога пракляла маці, пераўтварыўся ў дрэва). Каліна ўяўляе сабой расліну, надзеленую цнатлівасцю і нешчаслівай доляй.

*Песняй вясны лебядзінаю,*
*Скінуўшы зімнія чары,*
*Шэпчуцца явар з калінаю*
*Ў сумнай даліне над ярам.* [10, с. 365]

Максім Багдановіч у свах вершах перадае неад'емную сувязь пачуццяў з прыродай, яна ахвяруе чалавеку захапленне не толькі красою пейзажаў, музыкай вясновага квітнення, – яна дае яму адчуць і прыгажосць кахання. Красе кахання часцей за ўсё спадарожнічае ў Багдановіча хараство прыроды:

*Помніш толькі красу,*
*Мілы тварык дзявочы,*
*Залатую касу,*
*Сіняватыя вочы.*
*Цёмны сад – вінаград,*
*Цвет бяленькі, вішнёвы, –*
*І агністы пагляд,*
*І гарачыя словы.* [11, с. 37].

Любоўная лірыка ў Маскіма Багдановіча з'яўляецца і аповесцю аб маладосці і каханні чалавека Праз вершы можна пражыць і саму біяграфію песняра. І гэтыя песні аб маладосці, перакрэсленай невылечнай хваробай. У гэтай лірыцы, зразумела, менш услаўлення кахання, у ёй больш слоў аб пакутах ад яго.

Генадзь Бураўкін прадстаўляе пакаленне, якое дастаткова ўмерана выяўляла свае самыя запаветныя пачуцці, тым не менш, у яго вершах прысутнічаюць моманты, у якіх паэт кранальна пяшчотна і далікатна падае сваё ўспрыманне найвышэйшага моманту чалавечай ашчасліўленасці. Паэт працягвае фальклорную традыцыю класіка ва ўжыванні вобразаў-сімвалаў, такіх як дрэвы.

*Калітваёнаструненае цела*
*Цягнуласянястрымна да майго*
*І ўсё ў ва мне спявала і трымцела,*
*І кроў паліў адчайнасціагонь,*
*І мне чаромхаюляснаюпахлі*
*Распушчаныяваласытвае...* [2, с. 27]

*Вобраз сонца і вясны,* якія сімвалізуюць маладосць, прыгажосць, квяценне прыроды і душы, выкарыстоўвае для перадачы пачуццяў Янка Купала. Так, ў вершы «Не праспі вясну, дзяўчына!» назіраецца своеасаблівы заклік да дзяўчынкі. Паэт сцвярджае важнасць вясны і сонца, што ў чарговы раз падкрэслівае сувязь і адзінства навакольнага свету і душы чалавека.

*Спі, дзяўчына, покульсонца*
*Не зайграла над хацінай;*
*А як сонца на аконца*
*Бліскі кіне – ўстань, дзяўчына!* [12, с. 31]

Шчаслівае каханне ў вершах Генадзя Бураўкіна ці не аднаразова праходзіць выпрабаванне. Дарогі закаханых могуць разыходзіцца ў розных накірунках, раздзяляць іх на пэўныя адлегласці, але паэт не страчвае надзею на ўз'яднанне, бо гэта ўсяго часовае «раздарожжа». Менавіта вобраз-сімвал раздарожжа становіцца частаўжывальным і апазнавальным знакам Генадзя Бураўкіна, гэта добра назіраецца ў такіх вершах, як «Яшчэ доўга на ўсіх раздарожжах», «Зноў наш сад вечаровы весніцца», «Сотні раздарожжаў паміж намі»:

*Сотні раздарожжаў паміж намі,*
*Прывакзальны тлум*

*І шум травы.*
*Ды ўсё роўна над тваімі снамі*
*Я стаю –*
*Нядрэмны вартавы*[2, с. 37].

Цікавым з'яўляецца той факт, што амаль у кожным вершы Генадзь Бураўкін выкарыстоўвае слова «плячо», і гэта нездарма. Плячо асацыіруецца і сімвалізуе падтрымку – адзін з самых важных элементаў у адносінах.

*І мне не раз яшчэ*
*Салодка*
*Спаць на тугім тваім плячы*
………………………………
*Калі плячом гарачым*
*Ты прыпадала да майго пляча*
……………………………..
*Твае плечы*
*чакаюць маіх*
*нецярплівых далоняў…* [2, с. 83]

У інтымнай лірыцы Г.Бураўкіна важную ролю адыгрываюць пейзажныя дэталі, а менавіта вобразы-сімвалы прыроды (вясна, сонца). Гэта натуральна, бо закаханы чалавек адчувае навакольны асяродак больш тонка і пранікнёна, таму і сустракаем ў вершах апісанннi прыроды ці прыродных з'яў. Як правіла, яны нясуць у сабе адбітак настрою лірычнага героя, яго душэўнага стану.

*Я сцерагчы ўсё роўна буду*
*Цябе,*
*Шчаслівую ад сну,*
*Сябе,*
*Цыбатага няўклюду,*
*І нашу першую вясну…* [2, с. 34]

Распаўсюджаны і адметны вобраз-сімвал зоркі з'яўляецца і ў вершах Якуба Коласа. Як адзначана ў артыкуле Д.М.Алексенка: «*Праз вобразы касмічнага парадку – месяца, зорак – у песнях выразна выяўляецца эстэтычны аспект беларускай валачобнай традыцыі, ствараецца адметная атмасфера душэўнасці, дабрыні, зычлівасці, тым самым адлюстроўваючы дамінатныя рысы нацыянальнага менталітэту.*» Гэтая адметнасць добра прасочваецца ў вершы «Краска» Я.Коласа.

*Смуткавала краска-зорка*
*На мяжы зялёнай,*
*Пахіліўшы над разоркай*
*Галаву-карону.* [3, с. 337]

Генадзь Бураўкін у вершы «Суседка» праз вобраз-сімвал «зорка» выказвае да аб'екта кахання ці захаплення ацэнкі выключна ўзвышаныя, захапляльныя.

*Калі ўвечар да весніц выйшла*
*І стаяла пад вішнямі колкімі,—*
*Я цябе цалаваў цішаю,*
*Я цябе цалаваў зоркамі.* [2, с. 24]

Для перадачы прыгажосці, пяшчоты, лёгкасці і захаплення сваёй закаханай Янка Купала выкарыстоўвае вобраз-сімвал «краса» і «кветка». Адразу становіцца зразумела, якое трапяткое стаўленне да абранніцы.

*І я гадаю так і гэтак,*
*А ў сэрцысловы мне гучаць:*

*Ты не збярэшвясёлыхкветак,*
*І час прыйшоў твой замаўчаць.*[10, с. 278]
Генадзь Бураўкін удала перайняў традыцыю ўжывання вобраза-сімвала кветкі, гэта добра адлюстроўваецца ў вершы «Абцалую цябе…»
*А на грэшнай зямлі*
*Мы прысядзем пад яблыняй белай —*
*І ўсе кветкі і травы*
*Пакладу табе моўчкі да ног,*
*Ад нязнанага шчасця,*
*Ад удачы сваёй захмялелы,*
*Малады і наіўны*
*І твой раб,*
*І твой Бог...* [2, с. 14]
Лёгкасць і ўзрушанасць у вершах Канстанцыі Буйло увасобілася ў вобразе птушкі, нездарма, птушак лічаць вольнымі. Каханне надзяляе паэтку бязмежным і неабсяжным шчасцем.
*Будзіць дум яно смелых шырокі размах.*
*Ты кранешся рукой маёйцяжкайкасы -*
*І я лёгкайраблюся - як птах.*
*Мне здаецца, я дзесьці высока ляту,*
*Сэрца грэе бязмежнагашчасцяагонь.* [7, с. 274].
Як і ў Канстанцыі Буйло, узрушанасць, усхваляванасць у вершах інтымнай лірыкі Дануты Бічэль-Загнетавай дапамаге перадаць вобраз-сімвал птушкі.
*Нібыптушка,*
*як пчала на кветках.*
*Ты да крэсу.*
*Небыццё — наш крэс.* [13, с. 24]
Фальклорныя матывы жаночай долі, шчасця і няшчасця, ростаняў і сустрэчаў выразна прагучалі ў творчасці паэткі. Вобраз дзяўчыны-працаўніцы з верша «Сэрца дзявочае», што падказаў назву першаму зборніку паэткі «Дзявочае сэрца» нагадвае жняю з народных жніўных песняў:
*Цэлы дзянёк, да працы дасужая,*
*жыта вязала, сена зграбала.*
*Ногі самлелі, рукі знядужалі,*
*а сэрцу нястомнаму мала.*
*У Нёмане змыла стому-нягодніцу,*
*з лесу прынесла грыбоў у прыполе.*
*Змрок, нібы злодзей, паўзе за ваколіцу...*
*Сэрца сціскаецца – болей...* [6, с. 13]
Данута Бічэль-Загнетава – адна з яркіх прадстаўнікоў пісьменнікаў Гродзеншчыны, яе вершы напоўнены любоўю да роднага краю, нават свае пачуцці ў вершах інтымнай лірыкі яна ўвасабляе пры дапамозе вобраза-сімвала – ракі Нёман. Нёман адушаўляецца, набывае рысы каханага, праз чысціню, празрыстасць, але, ў той жа час, рашучасць і ўпэўненасць прасочваюцца адносіны паміж каханымі.
*Неман лашчыць, нібы ў сне,*
*чараты...*
*Можа, ён пазваў мяне,*
*а не ты?* [6, с. 13]

Важная адзнака сапраўднага кахання – яго непаўторнасць, менавіта такая рыса інтымнай лірыкі гродзенскай паэткі. Аднак, перадаць усю таямнічасць і важнасць слова, з'явы ці падзеі дапамагае вобраз-сімвал «рэха». Пааналізаваўшы зборнікі розных гадоў, можна адзначыць наяўнасць каля 50 такіх элементаў. Паэтка актыўна ўжывае гэтую незвычайную прыродную з'яву, падкрэсліваючы шырокі спектар эмоцый гэтага паняцця.

*– Мая, – крычаў ты ўсхвалявана мне.*

*– Мая... – пацвердзіў рэхам шчыры бор* [13, с. 11].

Адметнай рысай інтымнай лірыкі Д.Бічэль-Загнетавай з'яўляецца матыў сну. Паэтэса ў сваіх вершах часта звяртаецца да свайго каханага праз сон: гутаркі, падзеі, споведзі. Усё неспраўджанае ажыццяўляецца праз заплюшчаныя вочкі закаханай: «*Ці сняцца табе // Хвілінаю // Вусны // З гаркотай калінавай?*» [13, с. 23]

Прааналізаваўшы вершы інтымнай лірыкі Дануты Бічэль-Загнетавай і Генадзя Бураўкіна, упэўнена можна сцвярджаць аб умелым перайманні і працягу нацыянальнай традыцыі, але ў той жа час, нельга не заўважыць індывідуальны падыход у прояве сваіх пачуццяў.

Такім чынам, можна зрабіць выснову аб цеснай сувязі і перайманні нацыянальных лірычных традыцый сучасных творцаў Генадзя Бураўкіна і Дануты Бічэль-Загнетавай ад знакавых прадстаўнікоў беларускай класікі, такіх як Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Канстанцыя Буйло. Тэматычнае багацце і жанравая разнастайнасць – знакавыя паказчыкі як класічнай так і сучаснай паэзіі. Матыў абароны кахання, узрушанасці пачуццяў, матыў адзіноты, горычы ад разлукі, тугі і роспачы актыўна ўжываецца ў інтымных вершах філалагічнага пакалення пісьменнікаў. Умелае выкарыстанне фальклорных вобразаў-сімвалаў сонца, дрэў, вясны, кветак, зорак дае падставы меркаваць аб знакавасці і важнасці класічнага падмурка. Аднак, Данута Бічэль-Загнетава і Генадзь Бураўкін укладаюць сваё разуменне і свае пачуцці ў традыцыйнае бачанне свету, менавіта ў гэтым праяўляецца іх індывідуальнасць. Сучасныя творцы беларускай літаратуры такія як Г. Бураўкін і Д. Бічэль-Загнетава узбагацілі інтымную лірыку прнцыпова новымі індывідуальна-аўтарскімі рысамі, матывамі, вобразамі.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. – Т. 1. / Янка Купала. – Мінск: Маст. літ., 1997. – 462 с
2. Бураўкін, Г. Чытаю тайнапіс вачэй: вершы пра каханне / Г.Бураўкін. – Мінск, 2001. – 158 с.
3. Колас, Я. Збор твораў: у 20 т. Т. 2. – Вершы (1911–1938) / Якуб Колас; рэд. тома У. В. Гніламёдаў; падрыхт. тэкстаў і камент. С. В. Забродскай, К. А. Казыра; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Купалы. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 440 с
4. Багдановіч, М. Поўны збор твораў у 3 т. / М. Багдановіч. – Мн.: "Навука і Тэхніка", 1992 – 1995.
5. Буйло, К. Выбраныя творы: у 2 т. / К. Буйло. — Мінск : Маст. літ., 1981. — Т. 2 : Вершы, успаміны. — 334 с
6. Бічэль, Д. Дзявочае сэрца: вершы / Д. Бічэль. – Мінск, 1961 – 45с.
7. Буйло, К. Выбраныя творы: у 2 т. / К. Буйло. — Мінск : Маст. літ., 1981. — Т. 1 : Вершы, паэма. — 302 с
8. Бічэль-Загнетава, Д. Даўняе сонца: лірыка / Д. Бічэль. – Мінск, 1987. – 398 с.
9. Астраух, Аліна Эдмундаўна Традыцыі фальклорнай паэтыкі ў лірыцы Янкі Купалы і Рыгора Барадуліна / А. Э. Астраух // Міжнародныя Купалаўскія чытанні : матэрыялы навуковай канферэнцыі, Гродна, 25-27 лістапада 1997 г. / Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы ; рэд. кал.: Д. М. Лебядзевіч, М. У. Мікуліч, А. М. Пяткевіч. – Гродна : ГрДУ, 1999. – С. 170-174.
10. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. – Т. 1. / Янка Купала. – Мінск: Маст. літ., 1997. – 462 с
11. Багдановіч, М. Поўны збор твораў у 3 т. / М. Багдановіч. – Мн.: "Навука і Тэхніка", 1992 – 1995.
12. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. – Т. 4. / Янка Купала. – Мінск: Маст. літ., 1997. – 446 с.

13.	Бічэль, Д. Нёман ідзе: вершы / Д. Бічэль. – Мінск, 1964.–54 с.

**Ю. В. Стулов,**
*канд. филол. наук, доцент ( Минск, Беларусь)*

## ВИНА, ПРОЩЕНИЕ И ЛЮБОВЬ В ТВОРЧЕСТВЕ Л.Н. ТОЛСТОГО И ДЖ. БОЛДУИНА

***Аннотация.*** *В статье рассматриваются этические принципы выдающегося американского писателя середины XX века Джеймса Артура Болдуина, которые перекликаются с моральными императивами Льва Николаевича Толстого. Американский писатель хорошо знал литературу, в том числе русскую, а через Мартина Лютера Кинга, своего друга и лидера движения за гражданские права, испытал воздействие принципов непротивления злу Л. Н. Толстого, которые он не только проповедовал, но и пытался претворить в практической деятельности. Сравнение взглядов великого русского писателя с идеями популярнейшего афроамериканского автора XX века может помочь глубже понять роль Л. Н. Толстого в формировании идеологической платформы литературы афроамериканцев.*

***Ключевые слова:*** *Л. Н. Толстой; Джеймс Болдуин; афроамериканский роман; «черная революция»; нравственно-этические взгляды; концепция любви; моральное самоусовершенствование личности.*

**Y. V. Stulov,**
*PhD, Ass.Professor (Minsk, Belarus)*

## GUILT, FORGIVENESS AND LOVE IN THE WORKS OF LEO TOLSTOY AND JAMES BALDWIN

***Abstract.*** *The paper deals with the ethical principles of James Arthur Baldwin, an outstanding US mid-20$^{th}$ century writer, which echo the moral imperatives of Leo Tolstoy. The US writer knew literature very well, including Russian literature, and through Martin Luther King, Jr., his friend and leader of the Civil Rights movement, was greatly affected by Tolstoy's theory of non-resistance to evil, which he not only advocated but also tried to put into practice. The comparison of the great Russian writer's views with the ideas of the most popular African American writer of the mid-20th century can help understand Leo Tolstoy's role in forming the ideological platform of African American literature more deeply.*

***Key words:*** *Leo Tolstoy; James Baldwin; African American novel; the Black Revolution; moral and ethical views; the concept of love, moral self-perfectionю*

На протяжении всей жизни великого русского писателя *Л. Н. Толстого (1928 – 1910)* и одного из самых значительных американских литераторов XX-го века Дж. Болдуина (*James Arthur Baldwin, 1924 – 1987* ) темы вины, прощения и любви были ключевыми в их размышлениях о жизни и нашли свое отражение как в дневниках и эссеистике, так и художественном творчестве. Это и великие романы Л. Н. Толстого, его книга *«Путь жизни» (1910),* и многие другие произведения, и «Другая страна» *(Another Country, 1962)*, «Блюз Сонни» *(Jimmy's blues, 1983)* и публицистические сборники Болдуина. Мучительные душевные поиски морального императива, стремление найти смысл земного существования, сложные отношения с официальной церковью, вовлеченность в труднейшие общественные проблемы своего времени, характерные для Л. Н. Толстого, во многом повторяются в жизненном пути афроамериканского писателя, которого называют *«одним из самых интеллектуально одаренных критических мыслителей XX века»* [1]. Связывает их и глубокое понимание роли литературы и искусства в попытке изменения морального климата в обществе. Оба писателя много размышляли о том, что такое любовь,